Источник: "Беларуская думка" - № 9, 2012-09-18



## Науменко, Л.И. Белорусская идентичность. Содержание. Динамика. Социально-демографическая и региональная специфика / Л.И. Науменко. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 205 с. – ISBN 978-985-08-1423-4.




В монографии на богатом материале этнопсихологических исследований, проведенных среди населения Беларуси за последние 10 лет, анализируются данные о специфике белорусской идентичности в единстве ее гражданской, этнической, культурной и территориальной составляющих.

В издании на примере анализа образа Родины, этнических автостереотипов белорусов и других феноменов национального сознания исследовано содержание белорусской национальной идентичности. Автор стремится ответить на вопросы, как меняется белорусская идентичность, насколько устойчива ее структура и взаимосвязь между компонентами, изменилось ли отношение наших соотечественников к своей этничности и гражданству за эти годы. Среди результатов исследования, представленных в книге, особое научное и практическое значение имеет концептуальный подход к исследованию белорусской идентичности, его методологическое обоснование и методическая реализация в диагностике содержания, социально-демографической специфики и динамики ее базовых составляющих. Следует отметить, что работа выполнена на общереспубликанской репрезентативной социологической выборке методами психологического исследования. В отечественной психологии такое исследование, посвященное белорусской идентичности, было проведено впервые. Книга будет полезна как психологам, так и социологам, политологам, этнологам, занимающимся проблемами этнического и гражданского сознания, а также тем, кто интересуется социокультурными процессами, происходящими в современном белорусском обществе.

## Сучасная беларуская скульптура: XXI стагоддзе = Современная белорусская скульптура: XXI век = Modern Belarusian Sculpture: XXI Century: альбом /аўт. тэксту, склад., пер. на беларус. мову: К.С. Аксёнава; аўт. уступ. арт. Н.В. Шаранговіч. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2012. – 360 с.: іл. – ISBN: 978-985-11-0574-4.




*Выданні для падрыхтоўкі кніжнага агляду прадастаўлены магазінам «Академическая книга» www.akademkniga.by*

Гэты альбом – другое выданне з серыі «Сучаснае беларускае мастацтва». Першае – «Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе» – выйшла ў тым жа выдавецтве ў мінулым годзе. Кніга знаёміць чытачоў з творамі амаль 100 айчынных скульптараў розных пакаленняў, прэзентуе новыя імёны, дэманструючы разнастайнасць гэтай плыні нашага мастацтва. Нягледзячы на тое, што ў цэлым беларускія майстры гэтага жанру імкнуцца да захавання рэалістычных традыцый і пластычнай культуры, у айчыннай скульптуры выразна бачны адыход ад класічнага шляху. У апошнія дзесяцігоддзі ярка заяўляюць пра сябе творцы, якія шукаюць і знаходзяць новыя сродкі вобразнай выразнасці, працуючы ў манументальнай, станковай, мемарыяльнай і паркавай пластыцы.

У выданні прадстаўлены біяграфіі і творы скульптараў, сярод якіх і такія вядомыя, як Генадзь Буралкін, Іван Міско, Канстанцін Селіханаў, Мікалай Байрачны, Святлана Гарбунова, Валяр'ян Янушкевіч, і шэраг адносна маладых творцаў. Апроч біяграфічных даных, у звесткі пра майстроў унесены іх персанальныя сайты і электронныя адрасы, што дазваляе пры неабходнасці звязацца з героем альбома.

Асобны раздзел выдання прысвечаны помнікам, вакол якіх узніклі пэўныя народныя прыкметы. Так, напрыклад, лічыцца, што калі дакрануцца да ланцужка на шыі бабра, героя аднайменнай кампазіцыі ў Бабруйску (скульптар Уладзімір Гаўрыленка), пашанцуе ў азартных гульнях, а калі прысесці на лаўку каля бронзавай дамы ў Міхайлаўскім скверы ў Мінску (скульптар Уладзімір Жбанаў), то абавязкова пашчасціць у асабістым жыцці.

Альбом «Сучасная беларуская скульптура: XXI стагоддзе» разлічаны на шырокае кола чытачоў і можа годна прадставіць беларускае мастацтва як у нашай краіне, так і за межамі Беларусі. Дарэчы, і тэкст дадзены на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай.